## ОБЗОРЫ И РЕЦЕНЗИИ

**С. Я. Новікаў**

# МАЛАВЯДОМЫЯ СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ 1917–1991 гг.: ЛЁС ІНВАЛІДАЎ І ХВОРЫХ ЛЮДЗЕЙ

Diskriminiert – vernichtet – vergessen. Behinderte in der Sowjetunion, unter nationalsozialistischer Besatzung und im Ostblock 1917–1991. Herausgegeben von Alexander Friedman und Rainer Hudemann. – Stuttgart : Franz Steiner Verl., 2016. – 563 S.

На прэзентацыі, якая адбылася 20 верасня 2016 г. у нямецкай амбасадзе ў Мінску з нагоды выхаду новай кнігі «Diskriminiert – vernichtet – vergessen…» («Дыскрымінаваныя – знішчаныя – забытыя…»), яе навуковымі рэдактарамі была выказана слушная прапанова аб працягу сумеснай працы нямецкіх і беларускіх вучоных для далейшага вывучэння малавядомых пытанняў, якія датычаць гісторыі Беларусі ХХ ст., асабліва перыяду Другой сусветнай вайны. Як пераканаўча паказваюць вынікі праведзенага даследавання, у беларускай і нямецкай гістарычнай навуцы прадметам спецыяльнага вывучэння ніколі не была тэма інвалідаў, псіхічнахворых і іншых пацыентаў бальніц. Таму не выпадкова, што антрапалагічны падыход, які ў апошнія гады з’яўляецца адметнасцю ў сусветнай гістарыяграфіі, не абмінуў і сучасную нямецкую беларусістыку. У выніку стала магчымым выкананне навуковага праекта, прысвечанага людзям з абмежаванымі магчымасцямі ў Савецкім Саюзе, у час нацысцкай акупацыі і ва Усходнім блоку з 1917 па 1991 г., у цэнтр якога была вылучана Беларусь.

У ходзе прэзентацыі адзначалася, што дзякуючы намаганням амаль двух дзясяткаў аўстрыйскіх, беларускіх, нямецкіх, расійскіх і ўкраінскіх даследчыкаў гэта тэма набыла адметнае гучанне і пацвердзіла істотна важны факт, што некаторыя табуізіраваныя да гэтага часу аспекты гісторыі можна ўсебакова раскрываць падчас усталяванага дыялогу беларускіх і нямецкіх даследчыкаў. Заўважым, што гатоўнасць да такога дыялогу была закладзена ў нямецкай беларусістыцы і беларускай германістыцы 16 год таму, калі ў Гёцінгене ўпершыню пабачыла свет адмысловае выданне «Падручнік па гісторыі Беларусі».

У прадмове (с. 13–33) кіраўнік праекта Аляксандр Фрыдман і навуковы рэдактар новай кнігі Райнер Гудэман адзначаюць, што вялікая колькасць інвалідаў і псіхічна хворых людзей сталі ахвярамі за часам Другой сусветнай вайны. На іх думку, праца прэзентуе ў канцэнтраваным выглядзе вынікі беларуска-нямецкага даследчага праекта «Хворыя і людзі з фізічнымі абмежаваннямі ў Беларусі 1941–1944 гг.», які выконваўся пры падтрымцы Фонду Герды Хенкель з 2009 па 2012 г. у рамках спецыяльнай праграмы па падтрымцы маладых гісторыкаў у Расіі, Украіне, Малдове і Беларусі (с. 9).

Выбар Беларусі ў якасці цэнтральнага пункта быў не выпадковым. Гэта прадвызначае, па-першае, яе геаграфічнае становішча паміж Расіяй і Еўропай. Па-другое, адметнае гістарычнае развіццё на працягу XX ст. Па-трэцяе, шматэтнічны склад насельніцтва, сярод якога ў гісторыі краіны побач з іншымі значная роль належала яўрэям. Гэтыя і іншыя гістарычныя, грамадскія і навуковыя адметнасці выклікалі асаблівую ўвагу цяперашняй еўрапейскай гістарычнай навукі. Перапляценне на беларускай зямлі ў мінулым савецкіх, беларускіх, рускіх, польскіх, яўрэйскіх і нямецкіх інтарэсаў садзейнічалі таму, што менавіта Беларусь з'яўляцца адным з самых удалых прыкладаў для выяўлення адметных наступстваў Першай сусветнай войны і падзей хаатычнага міжваеннага часу, асабліва крывавых наступстваў ваенных гадоў. У прадмове адзначана, што на прыкладзе Беларусі можна было правесці даследаванне, якое паказвае такую малавядомую да гэтага часу важную праблему, як сітуацыя з інвалідамі і псіхічнахворымі ў сталінскім Савецкім Саюзе, раскрыць маштабы масавага знішчэння гэтых людзей на акупаванай савецкай тэрыторыі ў гады нацысцкай акупацыі, а таксама звярнуць увагу на распрацоўку праблемы ў СССР, у краінах Усходняга блока і ФРГ пасля заканчэння Другой сусветнай вайны.

Вырашэнню пастаўленых задач служыць структура кнігі, якая складаецца з 7 раздзелаў, дзе прадстаўлены 35 аўтарскіх матэрыялаў. У якасці дадаткаў прыведзены: карта Беларусі ў кантэксце акаляючых яе іншых усходнееўрапейскіх краін, спіс скарачэнняў, пералік геаграфічных назваў і імянны спіс, а таксама звесткі пра аўтараў.

Пачынаецца кніга з уводзінаў, дзе А. Фрыдман і Р. Гудэман паказваюць месца забойстваў інвалідаў і псіхічнахворых у кантэксце палітыкі вынішчэння, вызначаюць маштабы іх дыскрымінацыі ў грамадстве і прычыны абмежаванай увагі с боку навукі. Зыходзячы з пастаўленых задач, вывучэнне такіх наступстваў праводзілася на шматлікіх прыкладах, што датычаць Беларусі, Украіны, краін Прыбалтыкі (цяперашняй Балтыі. – *С. Н.*), пераўтвораных пасля ўсталявання дыктатур у нацысцкай Германіі і бальшавіцкім СССР у «крывавыя землі» (Т. Снайдэр) (с. 14). Апроч таго, гэтая праблематыка даследавалася на працягу значнага часу, пачынаючы ад усталявання ўлады Саветаў у СССР, у міжваенны і пасляваенны перыяды гісторыі гэтага рэгіёна, а таксама ў постсавецкі час. У прадмове адзначана, што знаёмства з айчыннай і замежнай гістарыяграфіяй вылучае актуальнасць даследавання такой праблематыкі на рэгіянальным узроўні (с. 17). Для раскрыцця праблем даследчая група выкарыстоўвала крыніцы нямецкага і савецкага паходжання з архіваў і бібліятэк Беларусі, Расіі, Польшчы, Літвы і Германіі. Прычым значная частка гэтых матэрыялаў у рамках праекты была ўведзена ўпершыню.

Закранаючы структуру кнігі, аўтары ўводзінаў адзначаюць, што яна падзяляецца на асобныя часткі, у якіх разглядаецца савецкая сістэма аховы здароўя, становішча медыцыны, псіхічнахворых і інвалідаў перад і пасля нападу Германіі на СССР, паказаны вобраз урачоў і пацыентаў у адлюст-

раванні савецкай і нацысцкай прапаганды, прыведзены матэрыялы аб выкарыстанні эўгенікі ў перадваенны і ваенны часы, падрыхтоўцы медыцынскіх кадраў перад вайной і ў гады германскай акупацыі. Сярод гэтага цэнтральным з’яўлялася пытанне аб забойстве інвалідаў і псіхічнахворых у гады вайны Германіі супраць Савецкага Саюза, а таксама аб тым, якую ацэнку атрымалі злачынныя дзеянні ў пасляваенныя гады ў СССР, ФРГ і ГДР.

У першым раздзеле (с. 37–46) беларускі гісторык С. Жумар знаёміць чытача з наяўнасцю архіўных матэрыялаў у фондах НАРБ, пасля чаго прыходзіць да наступнай высновы: нягледзячы на абмежаванасць крыніц у гады вайны ўвогуле архіўныя фонды даюць магчымасць для рэканструкцыі агульнай карціны аховы здароўя ў Беларусі і даследавання вышэй акрэсленай праблематыкі (с. 44),

Аб становішчы інвалідаў і хворых у СССР у перадваенны час вядуць размову ў другім раздзеле (с. 47–93) беларускія даследчыкі В. Матах і В. Латышава. У двух асобных матэрыялах В. Матах характарызуе становішча інвалідаў і паказвае магчымасці для іх грамадскай сацыялізацыі ў савецкім грамадстве ў перадваеннай Беларусі. В. Латышава прадстаўляе на прыкладзе горада Віцебска вынікі даследавання аб стане псіхіятрыі перад і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Аўтарамі трэцяга раздзела (с. 95–195) аб медыках і медыцынскай падрыхтоўцы ў перадваенны час і пасля пачатку германскай акупацыі з’яўляюцца нямецкія даследчыкі – Й. Вігерынг, А. Замойцкі і А. Фрыдман. Й. Вігерынг і А. Замойцкі прадстаўляюць лёсы савецкіх медыкаў у розных умовах і абставінах жыцця падчас разгляду аўтабіяграфічных матэрыялаў: члена Акадэміі навук Беларускай ССР Ф. А. Гаўсмана і заснавальніка беларускай школы нейрапатолагаў М. Б. Кроля. Наступны матэрыял А. Замойцкі прысвячае становішчу беларускіх псіхіятраў перад вайной і падчас германскай акупацыі. Далей Й. Вігерынг знаёміць чытача са структурай медыцынскага факультэта БДУ ў 1920-я гады. Заключны матэрыял, падрыхтаваны А. Фрыдманам, раскрывае малавядомую для беларускага чытача тэму аб «сярэдняй школе для медыцынскага персаналу», якая была створана і дзейнічала ў Баранавічах у 1942–44 гг. Пры гэтым аўтар паказвае асноўныя этапы яе гісторыі, якая была фактычна адзінай установай такога профілю на тэрыторыі генеральнай акругі «Беларусь» (с. 182). У матэрыяле прыводзяцца канкрэтныя даныя аб змесце навучання, персанале, зроблены аналіз навучэнцаў, паказана роля школы ў арганізацыі культурнага жыцця ў горадзе і інш.

У чацвёртым раздзеле (с. 199–305) ідзе гаворка пра гісторыю аховы здароўя, адлюстраваную прапагандай і замацаваную ў фактах жыццёвай рэчаіснасці. На пытанне аб паказе становішча ўрачоў у перадваенны час у святле савецкай прапаганды у сваім матэрыяле адказвае А. Замойцкі. А. Пясецкі раскрывае характар савецкай прапаганды ў 1930-я гады на прыкладзе аховы мацярынства і клопату дзяржавы і грамадства аб дзецях у СССР. Аб дзецях у фокусе савецкай палітыкі ў перадваенныя гады і за часам

вайны распавядае А. Пясецкі. Становішча інвалідаў праз прызму савецкай прапаганды раскрывае матэрыял В. Матаха. А. Фрыдман шукае сувязь паміж месцам інвалідаў у царскай Расіі і сталінскім Савецкім Саюзам. С. Бурмістр піша пра нацысцкую сістэму аховы здароўя ў акупаваным Мінску. С. Сілвановіч закранае розныя аспекты аховы здароўя ў адлюстраванні акупацыйнага друку на захопленай савецкай тэрыторыі ў 1941–1944 гг. Л. Сляповіч разглядае ў якасці прадмета свайго даследавання нефармальныя адносіны ва ўмовах пасляваеннага аднаўлення аховы здароўя ў Савецкай Беларусі.

Пяты раздзел (с. 311–352) прысвечаны малавядомай у беларускай гістарыяграфіі тэме – «эўгеніка – расавая гігіена – эўтаназія». Нямецкія гісторыкі знаёмяць чытача з паходжаннем гэтай з'явы (с. 311–320). Яны пішуць пра забойствы нацыстамі хворых у Эстоніі, Латвіі і Літве і наступствы ужывання яўгенікі ў прыбалтыйскіх краінах у міжваенны перыяд (с. 321–340), а таксама падчас германскай акупацыі.

Самым значным па аб'ёме з'яўляецца наступны раздзел (с. 355–478), дзе разглядаюцца розныя аспекты забойстваў інвалідаў, хворых і дзяцей на захопленай савецкай тэрыторыі ў 1941–1944 гг. Украінскі даследчык Д. Цітарэнка раскрывае пытанне аб медыцынскім абслугоўванні і забойстве нацыстамі хворых на Украіне за часам германскай акупацыі. Расійскі гісторык Б. Кавалёў прыводзіць багаты матэрыял аб знішчэнні псіхічнахворых і інвалідаў у паўночна-заходніх раёнах акупаванай Расіі. А. Фрыдман паказвае характар «аб'ектыўна непазбежных мерапрыемстваў», якія датычаць знішчэння людзей з фізічнымі і разумовымі адхіленнямі ў Шумяцічах (Смаленская вобласць) і Макар'ева (Ленінградская вобласць), а таксама хворых у раёне Мінска з далейшым адлюстраваннем гэтых фактаў у гістарыяграфіі. А. Замойцкі прапануе чытачу матэрыял аб мясцовых медыках і нацысцкіх забойствах пацыентаў бальніц у Магілёве. В. Латышава паказвае лёс псіхічнахворых і разумова адсталых ва ўмовах ваеннай паўсядзённасці, а таксама раскрывае праблему знішчэння пацыентаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. В. Матах дае агульны агляд становішча інвалідаў на тэрыторыі Беларусі. В. Латышавай, А. Фрыдманам і А. Пясецкім паказана трагедыя разумова адсталых дзяцей у Чэрвені Мінскай вобласці ў маі 1942 г. Высвятляюцца маштабы ўдзелу ў гэтым забойстве сілаў германскага вермахта і цывільнай улады. Х. Рас засяроджвае ўвагу чытача на фактах абыходжання армейскіх часцей 9-й палявой арміі вермахта з мірным насельніцтвам у Беларусі на прыкладзе лагера смерці ў Азарычах. Пры гэтым аўтар змяшчае абрыс карты вермахта аб правядзенні дэпартацыі непрацаздольнага мясцовага насельніцтва ў раёнах Парычы, Чырвоны Бераг, Рудабелка і Азарыч на 28.03.1944 г. (с. 478).

Асноўную ідэю перадапошняга раздзела (с. 481–507), прадстаўленага толькі двума матэрыяламі, складае пытанне аб стаўленні ў пасляваеннай Беларусі да нацысцкіх забойстваў, у тым ліку да хворых. А. Шаркоў раскрывае гэту тэму на пракладзе вызначэння мер пакарання савецкімі судовымі органамі ў дачыненні да нацысцкіх злачынцаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі

Беларусі ў гады германскай акупацыі. В. Барташ у сваім матэрыяле, апублікаваным на англійскай мове, ставіць у цэнтр разгляду цыган, якія, як і яўрэі, сталі ахвярамі нацысцкай палітыкі генацыду.

Заключны, восьмы раздзел, памылкова пазначаны лічбай VII, абагульняе матэрыялы вакол тэмы аб становішчы псіхічна хворых і інвалідаў ва Усходнім блоку ў пасляваенны і постсавецкі часы (с. 511–542). А. Фрыдман раскрывае яе на яскравым прыкладзе, выкарыстанні імя легендарнага лётчыка А. Марэс'ева ў прапагандзе сацыялістычных каштоўнасцяў у ГДР. Г. Вольхютэр паказвае людзей з душэўнымі і псіхічнымі хваробамі ў Беларусі пасля распаду СССР. Між тым цэнтральнае месца ў раздзеле займае заключны матэрыял Р. Гудэмана аб фактарах выжывання інвалідаў і псіхічнахворых у сітуацыі вайны. Аўтар заўважае, што гэты матэрыял з'яўляецца пэўным падсумаваннем усяго выдання. У ім ідзе гаворка пра 12 асноўных фактараў, якія вынікаюць з праведзенага даследавання і маюць дачыненне да характарыстыкі тых шансаў, якія ўзнікалі ў людзей пры збегу пэўных абставін, часу, акалічнасцяў і г.д. У іх ліку аўтар называе наступнае: 1) мэтавыя акцыі знішчэння; 2) праявы антысемітызму; 3) ідэалагічныя і сітуацыйныя рашэнні; 4) магчымасць эвакуацыі; 5) грамадскае стаўленне, ідэалогію і дыскрымінацыю; 6) абумоўленасць і мэтанакіраваныя абмежаванні; 7) «жывыя мінёры» і «заразныя вёскі»; 8) ваеннапалонных; 9) амбівалентнасць; 10) наступствы вайны і акупацыі; 11) факт прыналежнасці да гэтых катэгорый ахвяр; 12) палітыку забойстваў у рэйху як першы этап да небяспекі.

У якасці падсумавання вынікаў Р. Гудэманам прыводзіцца думка пра тое, што, дзякуючы праекту, удалося дыферэнцавана паказаць асаблівую пагрозу, якую несла вайна для інвалідаў і псіхічнахворых. Многія з вышэйзгаданых фактараў паўплывалі на індывідуальны лёс людзей гэтай катэгорыі. У гады вайны меліся сітуацыі, калі дзейнічалі іншыя механізмы небяспекі. Пасля правядзення даследавання становіцца відавочным, што фізічна і душэўна хворыя разам з інвалідамі павінны стаць асобным аб'ектам увагі цяперашняй грамадскай свядомасці.

Неабходна адзначыць, што ў цэлым рэцэнзаваная кніга з'яўляецца першым нямецкамоўным выданнем, прысвечаным малавядомай і малавывучанай гістарычнай праблеме. Аўтары не толькі вызначылі тэарэтычныя рамкі для далейшага вывучэння гісторыі інвалідаў і псіхічнахворых у Беларусі, але здолелі намаляваць адметную карціну іх паўсядзённага жыцця і выжывання ў розных умовах. На наш погляд, выданне хутка знойдзе свайго не толькі нямецкага, але і беларускага чытача ў тым выпадку, калі пабачыць свет яго пераклад. Спадзяёмся, што пастаўленыя ў ходзе праекта мэты набудуць свой рэальны працяг у беларускай гістарычнай навуцы з улікам дасягнутага выяўлення вузкіх тэмаў гэтай актуальнай, маладаследаванай і дыскусійнай праблематыкі.